УДК 930/94(476)”81/51”

# «БЕЛАРУСКІ СЛЕД» АЛЯКСАНДРА ГВАНЬІНІ

***Віктар Белазаровіч***
*Гродна, Беларусь*

У артыкуле раскрываецца ваенная і творчая дзейнасць італьянскага афіцэра-найміта Аляксандра Гваньіні ў перыяд ягонага жыцця і службы ў Вялікім Княстве Літоўскім. Акцентуецца ўвага на самым вядомым гістарычным трактаце XVI стагоддзя – «Хронiцы Еўрапейскай Сарматыі», узаемаадносінах аўтара з вядомым гістарыёграфам Мацеем Стрыйкоўскім.

***Ключавыя словы: гістарыяграфія, гістарычная хроніка, Вялікае Княства Літоўскае, Хроніка Еўрапейскай Сарматыі, плагіят***

Гісторыя Віцебска і яго наваколля ў XVI ст. звязана з імем вядомага італьянца Аляксандра Гваньіні (1538–1614).

Аляксандр Гваньіні (Aleksander Gwagnin) быў паланізаваным італьянцам: нарадзіўся на поўначы Італіі, але большую частку жыцця правёў у Рэчы Паспалітай.

Ён паходзіў з горада Верона Венецыянскай рэспублікі, належаў да старажытнага і знакамітага рода. У дзеда – Амброджа Гваньіні – было шасцёра сыноў. Старэйшы з іх, таксама Амброджа, ажаніўся на Барталамеі. У шлюбе нарадзіліся трое дзяцей: Аляссандра (Аляксандр), Франчэска, Клара.

Пра дзяцінства і юнацтва Аляксандра захавалася вельмі мала звестак. Але відавочна, што ён атрымаў добрыя веды па ваеннай тапаграфіі, інжынернаму мастацтву, вайсковай справе. Ад рыцарскай традыцыі сярэдневякоўя Гваньіні засвоіў абавязак быць веруючым хрысціянінам, мужна змагацца з ворагам, пісаць вершы, гуляць у шахматы, валодаць шпагай.

Бацька з-за недахопу сродкаў выехаў у 1555 годзе да Польшчы, а затым запрасіў туды сына. Іх на каралеўскую ваенную службу рэкамендавалі рускі ваявода Мікалай Сяняўскі і прускі герцаг Альбрэхт як добрых знаўцаў ваеннай і інжынернай справы [4, с. 311]. Кароль і вялікі князь літоўскі Жыгімонт ІІ Аўгуст, маці якога таксама была італьянкай, прывеціў жаўнераў-наймітаў [3] і прызначыў іх на службу ў Віцебскі замак. Так, у 1564 годзе адзін з чатырох ротмістраў Аляксандр Гваньіні ўзначаліў роту, якая складалася з 500 пехацінцаў і 10 коннікаў.

Веды і ўменні італьянца знайшлі сваё выкарыстанне на палях сражэнняў Інфлянцкай вайны. У ліпені 1561 года ён разам з бацькам прымаў удзел у штурме замка Таўрус (Тарваст) у Эстляндыі. Кіраваў войскам Вялікага Княства Літоўскага Мікалай Радзівіл Руды. Пад парахавую вежу падвялі падкоп і ўзарвалі яе. Затым жаўнеры спустошылі і спалілі замак. Частку маскавіцян узялі ў палон, а частку «парубалі». Потым з захопленымі гарматамі і іншымі ваеннымі трафеямі вярнуліся назад, у Княства [2, с. 505].

Таксама Аляксандр Гваньіні ўдзельнічаў у штурме Азярышчанскага замка. У 1564 годзе віцебскі ваявода Станіслаў Пац прарваў абарону маскавіцян і захапіў гарматы. Усіх,



ПолесГУ

хто ўцякаў, забілі. Пасля было знойдзена каля 8 тысяч варожых трупаў. Войска Княства ўзяло ўсю зброю, порах. Маскоўскі ваявода Тоўмак ледзьве ўцёк да густога лесу. Праўда, потым ён, умацаваўшы свае сілы, здолеў вярнуць Азярышча [2, с. 165].

Цікавасць выклікае сражэнне пад Невелем, дзе каронны гетман Станіслаў Лешнавольскі ў 1566 годзе выступіў супраць 40-тысячнага войска Андрэя Курбскага. Гваньіні, які быў удзельнікам бітвы, яе дакладна апісаў. Гетман, не маючы перавагі ў жывой сіле, загадаў запаліць шмат вогнішчаў і заняць зручнае ўмацаванае месца, акружанае з абодвух бакоў вадой. Паля дзённага бою палягло 15 тысяч маскавіцян. Курбскі, каб пазбегнуць пакарання, перайшоў на бок Вялікага Княства Литоўскага [2, С. 172–173].

У наступным 1567 годзе, 12 лістапада, Аляксандр Гваньіні ў складзе віцебскай пяхоты выступіў пад Веліж. Маскоўскае войска было разбіта. У палон папалі двое баярынаў – Аляксей Сімічоў і Багдан Грыгорый [2, с. 175].

Далей была Ула. Кароль і вялікі князь літоўскі Жыгімонт II Аўгуст накіраваў туды ў 1568 годзе гетмана ВКЛ Яна Хадкевіча. Штурм крэпасці не меў поспеху, паколькі абложаным у замку прыйшла дапамога з Полацка. Аднак пазней Улу заняў польны гетман Раман Сангушка. Ён выправіў пад крэпасць казакоў на чоўнах, а пяхотных ротмістраў Рачкоўскага і Тарнаўскага паслаў ноччу на штурм. Казакі высадзіліся на правы бераг ракі, пачалі прабіваць гарадскія брамы і запалілі сцены. Абаронцы крэпасці не чакалі нападу, таму разам з полацкім падмацаваннем моцна перапіліся. Сеча разгарнулася ў брамах. Тады Мікалай Салагуб фарсіраваў Улу і заняў замак.

У жывых засталося вельмі мала маскоўскіх жаўнераў: частку забілі пад час сражэння, частка згарэла, частка ўтапілася ў Дзвіне і Уле. Палон складаўся з ваявод Вельямінавых і 300 знатных асобаў, 800 стральцоў [2, С. 175–176].

Ротмітстр Аляксандр Гваньіні з даверанай яму пяхотай бараніў гарматы, паколькі праціўнік спрабаваў іх акружыць. Мужна адбіваючыся ратнікі выйшлі з акружэння. Праўда, сам Гваньіні быў паранены [2, с. 177].

На знакамітым Люблінскім сейме ён атрымаў рыцарскае званне «eques auratus» (залаты коннік), а ў 1571 годзе па прадстаўленню гетмана Хадкевіча італьянец быў зацверджаны ў польскім шляхецтве. Гваньіні атрымаў герб з выявай вожыка, паколькі прозвішча дзеда азначала па італьянску riccio – вожык [4, с. 314]. За ваенныя заслугі кароль даў найміту Філіпаўскае староства на мяжы Літвы і Прусіі. Таму ў 1574 годзе італьянец пакінуў ваенную службу, але гаспадарчая дзейнасць па вырабу паташу не мела поспеху. У 1576 годзе яму зноў прыйшлося вярнуцца да театра ваенных дзеянняў – прыняць удзел у ваеннай выправе на Гданьск [4, с. 315].

На працягу 18 гадоў Гваньіні выконваў ваенную справу, займаў пасаду каменданта Віцебскага гарнізона. Дзякуючы яму, мы ведаем знешні выгляд мясцовага замка, занатаваны ў «Апісанні Еўрапейскай Сарматыі»: «Витебск, довольно обширный деревянный город, лежит при славной и судоходной р. Двине, по которой сплавляются разного рода товары… В этом городе два весьма обширные и, благодаря удобному местоположению, весьма укрепленные замка; один из них, расположенный на равнине… называется Нижним замком, а другой – Верхний замок – лежит на довольно возвышенном холме. Оба эти замка укреплены башнями и стенами, которые построены из дуба и наполнены землею и камнем; замки достаточно снабжены военными снарядами и камнеметательными орудиями» [6].

Упершыню «Апісанне Еўрапейскай Сарматыі» было надрукавана ў Кракаве ў 1578 годзе. Гэта аб’ёмны твор з 203 аркушаў аўтар прысвяціў каралю Рэчы Паспалітай Стэфану Баторыю. Затым Гваньіні накіраваўся ў складзе пасольства Рэчы Паспалітай ў Італію – прасіў пазыку ў рэктара Вероны ў памеры 5000 дукатаў. Узамен абяцаў снарадзіць два караблі ў Гданьску смалой, ільном, каноплямі, салам, збожжам, лесам і мёдам. Але дарэмна [4, с. 317]. Ён зноў вяртаецца на сваю другую радзіму і прымае ўдзел у паходах Баторыя на Вялікія Лукі і Пскоў. Вярхоўная ўлада прызначыла яму штогадовую пенсію ў 200 злотых [7, с. 97].



Палесдзу

Восенню 1581 года Аляксандр Гваньіні ад'ехаў у Швецыю. Атрымаўшы рэкамендацыйныя лісты ад караля Юхана III і яго жонкі Кацярыны Ягелонкі ён зноў спрабуе арганізаваць гандлёвыя стасункі з Венецыяй. І зноў няўдача. Але дух прадпрымальніцтва не згас. Італьянец перамяшчаецца ў Кракаў да двара кракаўскага архіепіскапа. Яго там называлі familiaris noster (наш сябра). У мястэчку Келецъ ён арганізуе на базе мясцовай гуты выраб італьянскага шкла [4, с. 318].

Другое выданне гістарычнага трактата «Апісанне Еўрапейскай Сарматыі» убачыла свет у Спіры (1581 год), трэцяе – у Базэлі (1582 год), і так па 1611 год кніга выходзіла шэсць разоў.

У гістарычнай навуцы нявырашаным і спрэчным застаецца пытанне аўтарства гэтага выдання. Справа ў тым, што ў Віцебскім гарнізоне пад началам Аляксандра Гваньіні ваенную службу нёс будучы вядомы гісторык Мацей Стрыйкоўскі. На старонках «Хронікі Польскай, Літоўскай, Жамойцкай і ўсяе Русі», якая выйшла ў 1582 годзе, ён неаднаразова скардзіўся на італьянца, абвінавачваў яго ў плагіяце. У 1579 годзе Стрыйкоўскі заявіў, што Гваньіні чытаў рукапіс ягонай хронікі і выкарыстаў яе тэкст. Справа дайшла да караля. Стэфан Баторый сваім прывілеем ад 14 ліпеня 1580 года пацвердзіў літаратурную ўласнасць Мацея Стрыйкоўскага [1]. Магчыма гэта акалічнасць вымусіла Аляксандра Гваньіні з'ехаць у Швецыю. І толькі пасля смерці Мацея Стрыйкоўскага ён стаў бесперашкодна карыстацца навуковым трактатам ад свайго імя.

Гэту пазіцыю падзяляе вядомая беларуская даследчыца А. А. Семянчук [7, С. 97–98], але украінскія вучоныя, у прыватнасці Ю. Міцык [5, С. 9–10], польскія (Ф. Сабешчаньскі), маюць іншае стаўленне да праблемы. Па-першае, не знойдзены рукапіс, які Стрыйкоўскі даваў чытаць Гваньіні. А без яго нельга вызначыць ступень залежнасці абодвух твораў. Па-другое, плагіят мог прысутнічаць толькі ў першых двух кнігах «Апісання Еўрапейскай Сарматыі». Па-трэцяе, апошняе выданне працы Аляксандра Гваньіні, якое мела месца ў 1611 годзе, ахоплівае падзеі з гісторыі Рэчы Паспалітай, якія адбыліся ўжо пасля смерці Мацея Стрыйкоўскага.

Відавочна, што віцебская зямля стала месцам не толькі ваеннай службы, але і творчага станаўлення вядомага храніста Аляксандра Гваньіні. Несумненна, удзел у ваенных дзеяннях, узаемаадносіны з мясцовым насельніцтвам далі багаты матэрыял для «Апісання Еўрапейскай Сарматыі».


1. Аляксандр Гваньіні [Электронны рэсурс] / Беларуская Вікіпедыя. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/%D0%90%D0%BB%D1%8F%D0%BA%D1%81%D0%B0%D0%BD%D0%B4%D1%80_%D0%93%D0%B2%D0%B0%D0%BD%D1%8C%D1%96%D0%BD%D1%96. – Дата доступу: 02.09.2017.
2. Гваньїні, Олександр. Хроніка Європейської Сарматії / О.Гваньїні. - К. : Вид. дім "Києво-Могилянська академія", 2007. – 1006 с.
3. Грыцкевіч, А. Гваньіні / Анатоль Грыцкевіч // Вялікае Княства Літоўскае : Энцыклапедыя. У 2 т. Т.1. – Мінск : БелЭн, 2005. – С. 518–519.
4. Дячок, О. Хроніст Алессандро Гваньїні / Олег Дячок // Український археографічний щорічник. Випуск 8/9. – Київ – Нью-Йорк : Видавництво М. П. Коць, 2004. – С. 299–321.
5. Мицик, Ю. Вступ / Ю. Мицик // Гваньїні, Олександр. Хроніка Європейської Сарматії / О.Гваньїні. - К. : Вид. дім "Києво-Могилянська академія", 2007. – С. 5–33.
6. Сапунов, А.П. Историко-статистический очерк города Витебска / А. П. Сапунов [Электронный ресурс] / Полоцко-Витебская епархия. – Режим доступа: http://www.witebsk.orthodoxy.ru/i2/sapunov/sapunov_1.html. – Дата доступа: 02.09.2017.
7. Семянчук, А.А. Беларуска-літоўскія летапісы і польскія хронікі : Вучэбны дапам. / А. А. Семянчук. – Гродна : ГрДУ, 2000. – 161 с.